МІЖНАРОДНАЕ ГРАМАДСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ "ЗГУРТАВАННЕ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ "БАЦЬКАЎШЧЫНА"

№6 (112)
чэрвень 2011

# БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

## У НУМАРЫ:

### ЮБІЛЕЙНАЯ ВЫСТАВА АБ'ЯДНАННЯ МАСТАКОЎ-БЕЛАРУСАЎ БАЛТЫІ "МАЮ ГОНАР"

На выставе экспанаваліся творы 18 мастакоў аб'яднання. Адкрыла выставу дырэктар цэнтра "Ritums" спадарыня Вія Ліетэ. Вячка Целеш коратка расказаў пра аб'яднанне "Маю гонар", яго дзейнасць на працягу дваццаці год.

*Працяг на стар. 3*

### КУПАЛЛЕ Ў НЬЮ-ЁРКУ

Беларусы Нью-Ёрка ды наваколля сабраліся разам уначы з 18 на 19 чэрвеня ў парку ў Крос-Рыверы, што ў 30 мілях ад Нью-Ёрка, каб адзначыць Купалле.

*Працяг на стар. 4*

### ГАДАВЫ СХОД ЗГУРТАВАННЯ БЕЛАРУСАЎ У ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

На сходзе была абмеркаваная праца арганізацыі за мінулы год і зацверджаная Управа на наступны год.

*Працяг на стар. 4*

### ВЫЙШЛА КНІГА КАЗАК СЕРЖУКА ВІТУШКІ

У кніжцы змешчаны казкі на розныя святы (уключаючы казку на Дзень Волі), традыцыйныя беларускія батлейкі і казкі-пагулянкі.

*Працяг на стар. 6*

НАВІНЫ МГА "ЗБС "БАЦЬКАЎШЧЫНА"

# Навіны кампаніі "Будзьма беларусамі!"

### Другі фестываль AD.NAK! Шалёныя рэкламісты дацiснулі памяркоўных

AD.NAK! — гэта плянцоўка, якая аб'ядноўвае найбольш актыўную і перадавую частку прафесійнага грамадства ў галіне рэкламы, маркетынгу і PR. Фестываль арганізуецца грамадскай культурніцкай кампаніяй "Будзьма беларусамі!" і спецыялізаваным інтэрнэт-рэсурсам markrting.by. Асноўныя задачы правядзення сёлетнега фестывалю — звярнуць увагу прафесійных удзельнікаў рэкламнага рынку, а таксама грамадства Беларусі да рэкламы і іншых сродкаў маркетынгавых камунікацый, выкананых на беларускай мове; судзейнічаць выпрацоўцы нацыянальных прыярытэтаў у рэкламе; натхніць і падштурхнуць шырокае кола беларускіх спецыялістаў галіны да ўжывання найбольш цікавых і эфектыўных формаў і сродкаў камунікацыі на беларускай мове.

23 чэрвеня ў Міжнародным адукацыйным цэнтры ў Мінску адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Другога фестывалю беларускамоўнай рэкламы і камунікацыі AD.NAK! У працэсе гэтай захапляльнай дзеі высветлілася, што шалёных беларускіх рэкламістаў нашмат больш, чым памяркоўных.

Перад тым, як абвесціць даты Фестывалю, арганізатары разважалі, ці не прыспешваюць яны час. Але асцярогі выявіліся марнымі, калі стала вядомая колькасць пададзеных заявак. Калі на Першы фестываль было пададзена 105 работ ад 59 удзельнікаў, то сёлета іх колькасць вырасла амаль утрая — 298 заявак ад больш чым 100 удзельнікаў. Лідарам тут стала намінацыя "Дызайн & Art Direction", куды было пададзена ажно 86 работ.

Кожную намінацыю прысвяцілі чалавеку, які вылучаўся сваёй шалёнасцю, — Фройду, Чэ Гевару, Скарыну, Вітаўту ды іншым выбітным асобам.

Праўда, не ва ўсіх намінацыях былі абвешчаныя пераможцы. Так, напрыклад,

➲

журы вырашыла не прысуджаць узнагароду за найлепшую “Радыё ці аўдыёрэкламу”. Годных у гэтай сферы проста не знайшлося.

У шэрагу намінацый прысуджалі толькі асобныя месцы. А вось у такіх намінацыях як “СМІ”, “Сацыяльная рэклама” і, вядома ж, “Дызайн” было з каго выбіраць.

Сярод звыклых для рэкламных фестываляў намінацый сустракаліся і арыгінальныя. Як, напрыклад, “Нерэалізаваныя ідэі”. “Для нас гэта вельмі важны конкурс, бо менавіта дзякуючы ідэям рэклама і рухаецца наперад”, — сказаў вядоўца Ілья Маліноўскі.

Цырымонію разнастаілі выступамі Vinsent са сваім гуртом, а таксама гурт “Далі”. Пасля ўручэння прыза ў намінацыі “Каша суворауская” на сцэну падняліся скандалісты з “Разбітага сэрца пацана” з дуэтам “ЭВМ” і нават сыгралі звыш рэгламенту, прэзентаваўшы ў дадатак да свайго сэта песню пра Венесуэлу.

Сэнс намінацыі “Каша суворауская” быў у тым, каб “уганараваць” рэкламныя працы, якія ігнаруюць факты беларускай гісторыі і традыцыі айчыннай культуры або дэманструюць непрафесійны падыход да справы. Праўда, адзначылі не ўласна аўтараў, а тых, хто такія працы знайшоў і даслаў на конкурс. У спадзеве, што рэкламісты могуць смяяцца самі з сябе, прызы дасталіся працам “Мая Радзіма”, “Вкус Бульбаша” і “Шакаладная Хатынь”.

Пры канцы Ілья Маліноўскі і Руся падвялі вынікі шалёна-памяркоўнай латарэі. Высветлілася, што сярод удзельнікаў цырымоніі 148 шалёных і 48 памяркоўных. Шалёныя канчаткова даціснулі памяркоўных. На сканчэнне быў абвешчаны самы значны, на думку журы, грамад-

## Гісторыя Беларусі за пяць хвілін — гэта магчыма!

У межах сумеснага праекту “БудзьмаTUT” грамадска-культурніцкай кампаніі “Будзьма беларусамі!” і партала TUT.BY выйшаў першы прафесійна зроблены анімацыйны фільм, прысвечаны гісторыі Беларусі ад яе пачатку да нашых дзён.

Праект “БудзьмаTUT” мае на мэце зацікавіць беларускай гісторыяй і культурай шырокае кола людзей. Стваральнікі праекта перакананыя, што менавіта гэтыя каштоўнасці сёння могуць аб’яднаць такіх розных беларусаў.

Анімацыйны фільм “Будзьма беларусамі!” дае магчымасць паглядзець на нашую гісторыю ў новай, сучаснай графіцы. Аўтары ідэі — Юлія Ляшкевіч і кампанія “Будзьма беларусамі!” — увасобілі гісторыю Беларусі ў лёгкай, даступнай кожнаму форме. Шыкоўная анімацыя ад Юліі Рудзіцкай у музычным суправаджэнні Аляксандра Памідорава і Лявона Вольскага — такой гісторыі Беларусі вы яшчэ не бачылі!

Фільм быў выкладзены ў адкрыты доступ 28 траўня на партале TUT.BY. Цягам тыдня відэа стала хітом нумар адзін у байнэце, патрапіўшы ў Топ-10 праглядаў на Youtube і топ-3 на Yandex.

Мяжа ў 100 тысяч праглядаў за месяц, прагназаваная пасля закрытага прагляду скептычнымі блогерамі, была пераадоленая ўсяго за 4 дні. Так першая прафесіянальная гістарычная анімацыя з цэнтральнай падзеі праекту “БудзьмаTUT” ператварылася ў адлюстраванне высокай патрэбы беларусаў у сучасных відах мастацтва на глебе нацыянальнай культуры.

Поспех відэа не абмежаваўся Беларуссю. На Youtube ролік увайшоў у топ-10 відэа, што абмяркоўваліся ў свеце найбольш, і ў рэгіянальныя топ-100 самых прагляданых, напрыклад, у Чэхіі і Польшчы. У тройку найлепшых на Яндэкс-відэа ролік трапіў ужо ў першыя дні пасля з’яўлення.

Мультфільм размясцілі на сваіх сайтах Згуртаванне беларусаў у Вялікабрытаніі (http://belarusians.co.uk/) і Беларускі партал у Казахстане (http://belarus.kz/kultura/video). Запрашаем і іншыя беларускія суполкі ў замежжы, якім спадабаўся анімацыйны фільм “Будзьма беларусамі!”, па магчымасці размясціць яго на сваіх інфармацыйных рэсурсах у інтэрнэце.

Анімацыйны фільм “Будзьма беларусамі”, відэа-падкасты Лявона Вольскага, Ягора Сурскага, Алега Хаменкі, Міхала Анемпадыства, Святланы Бень ды іншых выбітных дзеячаў сучаснай беларускай культуры глядзіце на блогу “БудзьмаTUT” (http://tut.budzma.org/).

*Budzma.org*

*На першым фота сустаршыня арганізацыйнага камітэту Фестывалю AD.NAK! Ніна Шыдлоўская і музыка Аляксандр Памідораў.*

ВІНШАВАННІ

# ВІНШАВАННІ СЯБРАЎ ВЯЛІКАЙ РАДЫ



Маем гонар павіншаваць з Днём нараджэння сябраў Вялікай Рады Згуртавання беларусаў свету “Бацькаўшчына”, якія нарадзіліся ў ліпені і жніўні: **Алега і Наталлю Гардзіенкаў, Барыса Сачанку, Алеся Станкевіча, Уладзіміра Арлова, Адама Мальдзіса, Алега Трусава** (Беларусь), **Яўгена Грушу** (Аўстралія), **Сяргея Кандыбовіча** (Расія), **Алега Давідзюка, Рамана Вайніцкага** (Літва), **Ганну Сурмач** (ЗША), **Алеся Ядчанку** (Украіна), **Таццяну Казак** (Латвія), а таксама кіраўніка МГА “ЗБС “Бацькаўшчына” **Алену Макоўскую**. Жадаем вам выдатнага здароўя, шчасця, дабрабыту, узаемапаразумення з блізкімі, плёну ў працы, здзяйснення ўсіх вашых планаў.

У жніўні наступныя сябры Вялікай Рады адзначаюць юбілеі: 8 жніўня – айцец **Аляксандр Надсан** (Вялікабрытанія) і **Дзмітры Ярашэўскі** (Германія), 9 жніўня – **Янка Запруднік** (ЗША), 13 жніўня – **Марыя Міцкевіч** (Беларусь), 16 жніўня – **Віктар Чайчыц** (Расія), 28 жніўня – **Генадзь Бураўкін** (Беларусь). Віншуем вас з юбілеямі і зычым здароўя, бадзёрасці, аптымізму, натхнёнай працы, поспехаў ва ўсіх справах.

*Управа МГА “ЗБС “Бацькаўшчына”*

# ЮБІЛЕЙНАЯ ВЫСТАВА АБ'ЯДНАННЯ МАСТАКОЎ-БЕЛАРУСАЎ БАЛТЫІ "МАЮ ГОНАР"

Юбілейная выстава Аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар", прысвечаная 20-годдзю яго заснавання, адкрылася ў апошнія дні траўня ў Цэнтры культуры і народнага мастацтва Рыжскай думы "Ritums".

Аб'яднанне было заснавана 12 студзеня 1991 г. у Рызе. На ўстаноўчы з'езд у Рыгу прыехалі з Санкт-Пецярбурга Янка Чарнякевіч і Віктар Сівуха, з Эстоніі – Маргарыта Астравумава, а латвійскіх мастакоў-беларусаў прадстаўлялі Вячка Целеш, Ларыса Лойка, Мацей Чырыч і Валер Дзевіскіба. Тады ж старшынёй аб'яднання быў выбраны Вячка Целеш, а намеснікам – Маргарыта Астравумава.

З-за ўдзелу беларускіх мастакоў Вільні ў змаганні за незалежнасць Літвы ў гэтыя дні не змаглі прыехаць на з'езд Алег Аблажэй і Крысціна Балаховіч, але па тэлефоне яны падтрымалі заснаванне аб'яднання. Пазней да аб'яднання далучыўся са Швецыі Ян Кузьміцкі.

Першая мастацкая выстава "Маю гонар" адбылася ў верасні – кастрычніку 1991 г. у Ваенным музеі Латвіі. У студзені – лютым 1992 г., дзякуючы намаганням Маргарыты Астравумавай, выстава аб'яднання адбылася ў г. Кохтла-Ярве ў Эстоніі, у Музеі сланцу. У 1992 г. Міністэрства культуры РБ арганізавала выставу "Маю гонар" у Мінску. У наступным годзе падчас Першага з'езда беларусаў свету мастакі аб'яднання былі запрошаны на з'езд і ўдзел у выставе мастакоў – беларусаў свету "Жыве Беларусь". На жаль, гэтая выстава ў Беларусі стала і апошняй. З таго часу нацыянальнае аб'яднанне беларускіх мастакоў Балтыі не атрымала магчымасці ад сваёй этнічнай дзяржавы паказаць сваё мастацтва ў роднай Беларусі.

Агульныя выставы АМББ "Маю гонар" на працягу гадоў адбываліся ў Латвіі ў гарадах Рыга, Юрмала, Даўгаўпілс і Лімбажы, у Іыхве (Эстонія), Празе (Чэхія). Апрача гэтага кожная мастацкая суполка аб'яднання "Маю гонар" ладзіла выставы ў сваёй дзяржаве. Персанальныя выставы сябраў аб'яднання "Маю гонар" адбыліся ў Латвіі, Беларусі, Літве, Эстоніі, Расіі, Фінляндыі, Даніі, Германіі, Францыі, Канадзе і ЗША.

Прайшло дваццаць год з дня заснавання аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар" і па традыцыі гэты юбілей, як і папярэднія, мастакі адзначылі выставай сваіх твораў.

На выставе экспанаваліся творы 18 мастакоў аб'яднання. Латвійская суполка прадставіла творы 12 мастакоў. Гэта працы Анатоля Ермаковіча, Ларысы Лойка, Алены Лаўрыновіч, Васіля Малышчыца, Ганны Пейпіні, Алены Раманенка, Зіты Суднік, Ірыны Трумпель-Сабалеўскай, Пятра Худабчонка, Вячкі Целеша і фотамастачкі Алены Мельнік.

З Літвы экспанавалася праца толькі аднаго мастака Алега Аблажэя. Не змаглі прыняць удзел у выставе Крысціна Балаховіч, Сяргей і Алесь Поклады, а таксама Юры Грыгаровіч. Эстонскую суполку мастакоў "Маю гонар" на адкрыцці выставы прадстаўляла Людміла Прыбыльская. На жаль, не змагла прыехаць з Эстоніі намеснік старшыні АМББ "Маю гонар" Маргарыта Астравумава, а таксама Генадзь Курлянкоў з Нарвы. Аднак іх працы, якія былі дастаўлены ў Рыгу, годна занялі месца ў экспазіцыі юбілейнай выставы. Дзве жывапісныя працы на выставе прадстаўлялі мастака са Швецыі Яна Кузьміцкага, гэтыя карціны мастак раней падараваў Вячку Целешу. Пра самога мастака даўно нічога не чуваць, апошняя паштовая сувязь з ім перарвалася ў 2003 годзе, калі ён знаходзіўся ў Беластоку. Не

змаглі знайсці кантакт для ўдзелу ў юбілейнай выставе з мастачкай "Маю гонар" Кацярынай Вольскай, якая зараз жыве ў Швецыі. Аднак не губляем надзеі аднавіць гэтую сувязь.

Адкрыла выставу дырэктар цэнтра "Ritums" спадарыня Вія Ліетэ. Вячка Целеш коратка расказаў пра аб'яднанне "Маю гонар", яго дзейнасць на працягу дваццаці год, выказаў падзяку ўсім, хто спрычыніўся да адкрыцця выставы і выдання плаката і юбілейнага буклета-брашуры.

Беларуская імпрэза была багатай і на фарбы, і на добрыя словы. Павіншаваць мастакоў са святам прыйшлі ансамбль "Вавёрачка" Рыжскай Беларускай асноўнай школы разам з яе дырэктарам Ганнай Іванэ, гурт беларускай песні "Вытокі", старшыня Латвійскага таварыства беларускай культуры "Світанак" Ірына Кузьміч, прэзідэнт Саюза латвійскіх мастакоў Мартыньш Хэймратс.

Саветнік беларускай амбасады ў Латвіі Ігар Назарук перадаў віншаванне мастакам ад беларускага пасольства ў Латвіі. Прыемным падарункам для мастакоў "Маю гонар" стаў канцэрт былых вучаніц Беларускай мастацкай студыі "Вясёлка" сясцёр Людмілы і Лаўры Ігнатавых. Добрай музыкай парадаваў мастакоў рыжанін-беларус, піяніст і кампазітар Дзмітрый Чарняўскі.

Віншавалі беларускіх мастакоў прэзідэнт канцэрна "Рада" Янка Кабановіч, старшыня Асацыяцыі нацыянальных культурных таварыстваў Латвіі імя Іты Казакевіч, доктар мастацтваў, прафесар Латвійскай акадэміі музыкі Рафі Харадженян, мастакі, прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў Латвіі і інш.

Дапамогу ў арганізацыі адкрыцця выставы аказала Латвійскае таварыства беларускай культуры "Світанак".

*Вячка Целеш, старшыня Аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар"*
*svitanak.lv*

# ЕГУ АДКРЫЎ ДАКТАРАНТУРУ

Міністэрства адукацыі і навукі Літвы дазволіла ЕГУ адкрыць дактарантуру сумесна з універсітэтам Вітаўта Вялікага і Літоўскім інстытутам даследавання культуры.

Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт быў зачынены ў 2004 годзе ў Мінску. Ад 2005 года размяшчаецца ў Вільні. Мае статус літоўскай ВНУ. У ЕГУ навучаюцца многія студэнты, якія былі выключаны з беларускіх ВНУ па палітычных матывах.

*"Наша Ніва"*

# КУПАЛЛЕ Ў НЬЮ-ЁРКУ

**Беларусы Нью-Ёрка ды наваколля сабраліся разам уноч з 18 на 19 чэрвеня ў парку ў Крос-Рыверы, што ў 30 мілях ад Нью-Ёрка, каб адзначыць Купалле. Пра тое, як прайшло свята, піша Валянціна Якімовіч*.**

Нас было каля сарака чалавек. Сабралася вельмі прыемная кампанія, дзе не было ні аднае асобы, каго не хацелася б бачыць.

Першае, што зрабілі маладыя волаты Арцём Міхайлоўскі з Наваполацка і Дзяніс Таўпека з Салігорска, што завіталі на Купалле ажно з Філадэльфіі, замацавалі наўкола нашых купальскіх мясцінаў бел-чырвона-белыя сцягі. Потым яны на чале з Пятром Рыжым, а з імі Сяргей Трыгубовіч з маленькім Міколкам, да якіх далучыўся і Віктар Дудараў са сваім 10-гадовым сынам Лявонам, нарыхтавалі сухога ламачча для вогнішча на ўсю ноч.

Усе апрануліся ў строі, што я вырабляю цягам многіх гадоў, і адчулі адказнасць за Купалле. Гледачоў сярод нас не было. Купалішам абралі прыгожага, высокага і спрытнага Алеся Тура, што заўжды нясе пазітыўную энергію і добры настрой, а Купалінкаю – Алену Ахмяненка, якой пры яе рыжавата-русых валасах і мармуровабелай скуры з румянцам на шчаках васількова-рамонкавы вяночак быў вельмі да твару. Заспявалі ды павялі па сонцу свае карагоды. Прыемна было, што на свяце было шмат дзетак, праўда, адных хлапчукоў. Купальшчыку Данілку Вінакураву ўсяго паўтара гады, а ён ужо старанна тупаў з намі ў карагодах на сваім першым Купаллі, а побач з ім – на руках у маці прымасцілася Стэфаніда Салавей, якая ўсяго на два месяцы старэйшая за Данілку. Было сярод нас нямала і тых, хто былі на Купаллі ўпершыню, адчулі ягоны подых тут, сярод нас.

Як скралі Купалінку-Аленку, Купаліш-Алесь знайшоў яе і на руках прынёс да купальскага вогнішча, дзе працягваліся спевы і гульні. Спалілі Марэну, як знак перамогі святла і дабра над цемраю і злом. Тут падаспеў, хоць са спазненнем, Сяржук Сокалаў-Воюш з жонкаю і сынамі. З імі прыйшла і мастачка-вышывальшчыца абразоў Люба Карпава. А калі пачаліся скокі праз вогнішча, то Купаліш, утрымліваючы свой пачэсны дубовы вянок, так лоўка і віртуозна пачаў скакаць праз яго, што было люба-дорага паглядзець. Нават я, распарадчыца свята, не ўтрымалася і пераскочыла разам з ім, а потым і з іншымі не адзін раз, ды і дзяўчаты не баяліся агню. А пасля дэгустацыі крупніку ўсе размясціліся вакол вогнішча і пачаліся абрадавыя спевы ўперамешку з пазаабрадавымі ды бардаўскімі пад гітару Воюша.

*Весткі й паведамленні Нью-ёркскага аддзела БАЗА, №7 (545) ліпень 2011 г.*

*Надрукавана ў скароце.

## У ЛОНДАНЕ ПРАЙШОЎ ГАДАВЫ СХОД ЗГУРТАВАННЯ БЕЛАРУСАЎ У ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

Гадавы сход Згуртавання беларусаў у Вялікабрытаніі (ЗБВБ) прайшоў 28 траўня.

На сходзе была абмеркаваная праца арганізацыі за мінулы год і зацверджаная Управа на наступны год. Кіраўніком арганізацыі была абраная Лёля Міхалюк, якая ўзначальвае ЗБВБ ўжо цягам некалькіх гадоў. Таксама абмяркоўвалася пытанне новага статуту Згуртавання, які цяпер рыхтуецца.

Згуртаванне беларусаў у Вялікабрытаніі – найстарэйшая беларуская арганізацыя ў Вялікабрытаніі, заснаваная ў 1946 г. Арганізацыя падтрымлівае беларускае жыццё ў краіне ў яго розных праявах, выступае за дэмакратызацыю і ўмацаванне незалежнасці Беларусі і супрацоўнічае з арганізацыямі ў Беларусі і замежжы.

*belarusians.co.uk*

## Старажытнае беларускае Купалле прадэманстравалі ў Беластоку

Імпрэзу арганізавала кафедра беларускай філалогіі. Студэнты, апранутыя ў народныя строі, паказвалі абрады, звязаныя са святам Купалля. Былі танцы, скокі праз вогнішча ды спяванне купальскіх песень.

Мерапрыемства прайшло ў межах акадэмічнага дня Беластоцкага ўніверсітэта. Па словах выпускніка факультэта філалогіі Міхала Грэся, імпрэза была арганізавана з мэтай заахвоціць маладых людзей паступаць на факультэт беларускай філалогіі.

*Паводле "Радыё Рацыя"*

## Дні беларускай культуры ў Вроцлаве

У польскім Вроцлаве з 31 траўня па 5 чэрвеня праходзілі Дні беларускай культуры. Іх арганізатарамі выступіла польская фундацыя "За вашу і нашу вольнасць" і мясцовы ўрад Вроцлава. Ініцыявалі правядзенне Дзён беларускія студэнты, якія вымушаныя вучыцца па-за межамі Беларусі.

Дні распачаліся адкрыццём выставы сучаснага жывапісу Беларусі мастакоў Аляксея Марачкіна, Генадзя Драздова, Уладзіміра Кіслага ды іншых. У той жа дзень, 31 траўня, адбыўся вечар беларускай паэзіі ды сустрэча з беларускім пісьменнікам Уладзімірам Арловым.

Таксама ў межах Дзён культуры прайшлі канцэрт гурта "Рэха", вечары салідарнасці з палякамі ў Беларусі і з беларускім народам ды тэатральны вечар, падчас якога быў паказаны спектакль "Правінцыя" гарадзенскага тэатра.

*Паводле "Радыё Свабода"*

# БЕЛАРУСКАЕ КУПАЛЛЕ Ў ІРКУЦКУ

Беларусы Іркуцка адзначылі старажытнае беларускае свята Купалле ў ноч з 25 на 26 чэрвеня на беразе ракі Ангара. На свята сабралася каля трохсот чалавек, многія былі ў нацыянальных беларускіх строях, пашытых сваімі рукамі.

Удзельнікаў свята чакалі беларускае застолле, цуды Купальскай ночы: пошук чароўнай папараць-кветкі, скокі праз агонь, карагоды і традыцыйныя беларускія гульні, пошукі Купалінкі, праводзіны русалак, варажба на вяночках і начная беларуская дыскатэка!

Старшыня Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Я. Чэрскага Алег Рудакоў распавёў: "У гэтым годзе сабралася не так шмат народу, як бывала, – каля трохсот. Але затое атмасфера была больш сяброўская, утульная. Прыехалі тыя, хто адчувае неабходнасць гэтага свята, а не проста жадае павесяліцца на свежым паветры".

Дарэчы сказаць, арганізатары свята і не гоняцца за вялікай колькасцю ўдзельнікаў.

"Мы спецыяльна не даём шырокай рэкламы свята, – кажа Алег, – калі прыедзе да паўтысячы чалавек, то ім самім будзе складаней. Аднойчы сабралася чалавек пяцьсот, і давялося рабіць два вогнішчы, вакол кожнага – карагоды ў тры шэрагі. Зараз прыязджае ўсё больш моладзі, чым людзей сярэдняга ўзросту – моладзь больш рамантычная, і ёй лягчэй вытрымаць ноч без сну".

Бліжэй да раніцы гасцей частавалі зварам – гэта гарбата з траў, прыгатаваная на вогнішчы. А на досвітку – абрад купання ў гаючай вадзе. Гэта дае непаўторны зарад эмоцый, якога абавязкова хопіць да наступнага года.

*Паводле Нікі Пясчынскай, газета "Маланка"*

# ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ СВЯТОЙ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У ТАРОНТА

Парафія Св. Кірылы Тураўскага ўрачыста адзначыла Дзень Святой Еўфрасінні Полацкай. З аповедам пра жыццё і дзейнасць славутай беларускай асветніцы выступіла пісьменніца Вольга Іпатава, аўтарка першай у беларускай літаратуры аповесці пра Еўфрасінню Полацкую "Прадслава"(1971 г.).

Яна таксама расказала аб тагачаснай рэакцыі ўладаў на свой твор – пачынаючы ад разгромнай рэцэнзіі гісторыка Л. Абэцадарскага ў "Советской Белоруссии" да рэзка негатыўных водгукаў у абласным і раённым друку Беларусі. Пазней гэтая аповесць увайшла ў школьныя праграмы і некалькі разоў перавыдавалася, у тым ліку ў Балгарыі.

Уладыка Святаслаў, епіскап Наваградскі і Паўночна-Амерыканскі Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы падзяліўся з прысутнымі звесткамі аб гісторыі кананізацыі Св. Ефрасінні і аб высілках нацыянальных рэлігійных дзеячоў па вяртанні парэшткаў святой спачатку з Кіева-Пячэрскай лаўры, а потым з Масквы, дзе пасля прыходу да ўлады бальшавікоў ейныя цудадзейныя мошчы былі выстаўленыя ў музеі атэізму.

*Юры Трубец*

# АТРЫМАНА ПАСВЕДЧАННЕ АБ СМЕРЦІ АНТОНА ЛУЦКЕВІЧА

Напрыканцы траўня Маргарыта Пярова, унучатая пляменніца Старшыні Рады Міністраў і міністра замежных справаў Беларускай Народнай Рэспублікі Антона Луцкевіча, атрымала з аддзела запісу актаў грамадзянскага стану па г. Аткарску і Аткарскім раёне Саратаўскай вобласці пасведчанне аб смерці свайго знакамітага родзіча.

У свой час у часопісе ARCHE былі надрукаваныя дакументы аб смерці Антона Луцкевіча на перасыльным пункце ў г. Аткарск, а ў кнізе яго твораў "Барацьба за вызваленне" (2009) — фотакопіі рапарта начальніка санітарнай часткі начальніку Аткарскага перасыльнага пункта аб смерці А. Луцкевіча і акта аб яго пахаванні. Аднак у некаторых даведніках да гэтага часу пішуць, што А. Луцкевіч памёр "каля 1946 г.". З дакумента, атрыманага Маргарытай Пяровай, вынікае, што запіс акту аб смерці Антона Луцкевіча за нумарам 390 зроблены яшчэ 30 лістапада 1943 года.

Трэба спадзявацца, што цяпер у даведачнай літаратуры і ў электронным каталогу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў прыватнасці будуць паведамляць праўдзівую дату смерці аўтара акта 25 Сакавіка.

*Анатоль Сідарэвіч, "Наша Ніва"*

# Пікет пад бел-чырвона-белымі сцягамі ў Парыжы

Сябры Беларуска-Еўрапейскага Задзіночання зладзілі інфармацыйны пікет у цэнтры Парыжа. Яны раздавалі мінакам улёткі пра палітычную і эканамічную сітуацыю ў Беларусі.

Арганізатар пікету Павал Хівук адзначыў: "Мяне дужа ўразіла жаданне парыжскай паліцыі пайсці насустрач і вырашыць усе арганізацыйныя пытанні праз электронную пошту. У выніку, уся працэдура па атрыманні дазволу склалася з адсылання факсу ў паліцыю і электроннай перапіскі".

Мерапрыемства выклікала вялікую цікаўнасць у журналістаў і мінакоў.

*Паводле "Радыё Свабода"*

## У ГАЙЛЕНД-ПАРКУ ПРАЙШОЎ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧЫ КАНГРЭС БЕЛАРУСКА-АМЕРЫКАНСКАГА ЗАДЗІНОЧАННЯ

У адпаведнасці са Статутам Беларуска-Амерыканскага Задзіночання (БАЗА) раз на два гады праводзяцца справаздачна-выбарчыя Кангрэсы. Чарговы Кангрэс адбыўся 28 траўня ў грамадскай залі пры беларускай царкве ў Гайленд-Парку ў Нью-Джэрсі.

У Кангрэсе бралі ўдзел дэлегаты ад аддзелаў і гурткоў БАЗА – з Нью-Джэрсі, Нью-Ёрка, Вашынгтона, Кліўленда, Канэкцікута, Каліфорніі. Сваіх дэлегатаў на Кангрэс не прыслаў Нью-ёркскі аддзел, які ўжо працяглы час канфліктуе з Галоўнай управаю. Нью-Ёрк прадстаўлялі дэлегаты Бруклінскага аддзела, які быў створаны год таму.

Старшынствавaў на Кангрэсе сп. Вітаўт Кіпель, вядомы дзеяч эміграцыі і шматгадовы сябра БАЗА. Са справаздачным дакладам выступіў старшыня Галоўнай управы БАЗА сп. Вячка Станкевіч, свае справаздачы зрабілі сябры Галоўнай управы і прадстаўнікі Аддзелаў і Гурткоў. Асабліва змястоўнымі былі даклады пра дзейнасць Бруклінскага аддзела сп. Расціслава Гарошкі, сп. Ірыны Аскіркі з Вашынгтона і сп. Ірыны Бакланавай з Канэкцікута. Таксама пра сваю працу па выданню перыёдык распавялі сп. Ганна Сурмач – адказны рэдактар газеты "Беларус" і сп. Віталь Алісіёнак – прадстаўнік ад англамоўнага часопіса "Беларускае рэвю". Усе справаздачы былі прынятыя і адобраныя дэлегатамі.

У другой палове Кангрэсу адбыліся выбары новага кіраўніцтва БАЗА – старшыні і складу Галоўнай управы.

Старшынёю Галоўнай управы была абраная сп. Ганна Сурмач.

На завяршэнне Кангрэсу дэлегатамі і прадстаўнікамі новаабранага кіраўніцтва былі выказаныя меркаванні, прапановы, парады і пажаданні адносна будучай дзейнасці БАЗА на сёмым дзесятку яго існавання.

*Інфармацыйны цэнтр МГА "ЗБС "Бацькаўшчына"*

НАВІНЫ ДРУКУ

## ВЫЙШЛА КНІГА КАЗАК СЕРЖУКА ВІТУШКІ




У выдавецтве Змітра Коласа выйшла кніга казак і дзіцячых п'есак легендарнага віленчука Сержука Вітушкі. У кніжцы змешчаны казкі на розныя святы (уключаючы казку на Дзень Волі), традыцыйныя беларускія батлейкі і казкі-пагулянкі.

Сяргей Вітушка, лідар колішняй "Талакі", легендарнага моладзевага аб'яднання, кажа, што ягоную кнігу выдавалі таксама талакою, і праблемы з грашыма не паўстала. 500 даляраў зарабіў сам Сяргей. Тры месяцы на хвалях Польскага радыё рэгулярна гучалі ягоныя ўспаміны пра "Талаку", пра моладзевы рух, ганарар за гэта аўтар цалкам прызначыў на ўласную кнігу. Сабраных грошай хапіла, каб заплаціць за друк, бо да друку кнігу рыхтавалі па-сяброўску, без аплаты.

Усім ахвярадаўцам, прозвішчы якіх пералічаны ў кнізе, Сяргей падзякаваў яшчэ летась у красавіку.

Рэдагаваў кнігу былы "майстровец" Сяргей Дубавец. І справа не толькі ў тым, што ён добры рэдактар, але ён добры сябра. Сяргей Вітушка – вельмі хворы чалавек, адным з наступстваў цукровага дыябету, на які ён пакутуе з падлеткавага ўзросту, стала поўная страта зроку. Даймаюць і іншыя цяжкія праблемы са здароўем. Кнігу рэдагавалі ў лякарні. Сяргей Дубавец рэгулярна наведваў Вітушку, і некалькі месяцаў даводзілася выкройваць час паміж медычнымі працэдурамі. Можна толькі ўявіць, як гэта цяжка займацца тэкстам усляпую. Але засяроджаная праца над словам, відаць, і дапамагала, адцягваючы думкі ад балячак.

Малюнкі для кнігі зрабіў Міхал Анемпадыстаў. Карэктуру прачытала сястра Сяргея – Ларыса Сагановіч, якая працуе ў выдавецтве "Роднае слова". Такім чынам, кніга зроблена на высокім прафесійным узроўні.

***

**Сяргей Вітушка. "Дзінь-дзілінь. Пара гуляць у казкі"/ Ілюстрацыі Міхала Анемпадыстава. — Мінск: Зміцер Колас, 2011. — 114 с. Цвёрдая вокладка.**

*Ганна Гарачка*

## ФЕСТЫВАЛЬ "ГУЧЫ ГОМАН БЕЛАРУСКІ" Ў ІРКУЦКУ

**VII абласны фестываль-конкурс "Гучы гоман Беларускі", прысвечаны 15-годдзю Рэгіянальнай грамадскай арганізацыі "Іркуцкае таварыства Беларускай культуры імя Яна Чрскага" і 350-годдзю горада Іркуцка, адбыўся 28 траўня ў актавай зале Адміністрацыі правабярэжнага акругі Іркуцка. Пра свае ўражанні ад фестывалю піша адна з яго ўдзельніц, сябра ІТБК імя Я.Чэрскага Святлана Бастракова.**

Да гэтай падзеі рыхтаваліся, яе чакалі, і 28 траўня мы горача віталі беларускія калектывы з усёй Іркуцкай вобласці.

Удзел у фэсце вельмі і вельмі парадаваў і згуртаваў удзельнікаў і гасцей фестывалю. Зала была поўная. Мы прыйшлі з роднымі і блізкімі, сябрамі, таму фестываль прайшоў у цёплай атмасферы дружбы і супрацоўніцтва.

Па ўмовах фэсту калектывам была прадстаўлена магчымасць паказаць па 2 нумары. І тут былі прадэманстраваны разнастайнасць і багацце беларускай культуры, да якой мы ставімся з вялікай пашанай і павагай! Са сцэны лілася беларуская гаворка, песенныя і танцавальныя нумары былі прадстаўлены ў розных тэхніках і жанрах, ад народнай да сучаснай. Мы ўбачылі дзіцячую тэатральную творчасць у выглядзе пастаноўкі казкі "Калабок". З гонарам любаваліся касцюмамі калектываў, бо часцей за ўсё адзенне – творчае ўвасабленне культуры Беларусі – пяшчотна і клапатліва, з любоўю зробленае сваімі рукамі.

Былі і такія калектывы, якія на сцэну выйшлі ўпершыню. Узрост удзельнікаў у прамым сэнсе гэтага слова прадстаўлены ад малога да вялікага, ад дзіцячага сада да глыбока шаноўных гадоў. Упершыню сваё майстэрства паказалі бабулі, якім ужо споўнілася па 90 гадоў! Яны ад душы, лёгка і непасрэдна рассмяшылі гледачоў і ў той жа час далі акунуцца ў непаўторнае багацце і глыбіню аўтэнтычнай беларускай песні. Зала не хацела іх адпускаць і пляскала ад душы, з вялікім жаданнем ўбачыць іх яшчэ не раз на фестывалі.

*Святлана Бастракова*

## Акцыя салідарнасці ў Жытоміры

Акцыя салідарнасці з беларускімі палітвязнямі прайшла 19 чэрвеня ва ўкраінскім Жытоміры. За пасярэдніцтвам Ігара Коктыша, палітычнага ўцекача з Беларусі, былі сабраныя подпісы ўкраінцаў за вызваленне затрыманых за ўдзел у акцыі

пратэсту 19 снежня.

Петыцыя была накіраваная беларускім уладам. На думку Ігара Коктыша, галоўная мэта акцыі – прыцягнуць увагу жыхароў Украіны да беларускай сітуацыі – была дасягнутая.

"На мой погляд, акцыя прайшла вельмі паспяхова для такога горада як Жытомір. Было сабрана 300 подпісаў – гэта вельмі шмат, – адзначыў Ігар Коктыш. – Людзі рэагавалі пазітыўна, хоць вядома былі і негатыўныя меркаванні, але гэта ў асноўным былі людзі старэйшага пакалення з камуністычнымі поглядамі".

*Паводле "Радыё Рацыя"*

## У Нью- Ёрку прайшла Хіратонія Епіскапа БАПЦ

Знамянальная падзея ў жыцці Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы адбылася 19 чэрвеня у Нядзелю Усіх Святых. У Кафедральным Саборы Св. Кірылы Тураўскага ў Нью-Ёрку ўрачыста прайшла хіратонія новага Епіскапа БАПЦ, ім стаў Уладыка Серафім.

Высвячэнне адбылося з удзелам галавы БАПЦ Уладыкі Святаслава, прадстаўнікоў Украінскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў ЗША і дзеючых святароў БАПЦ – айца Міхаіла з Сабора Св. Кірылы Тураўскага і айца Зіновія з Царквы Жыровіцкае Іконы Божае Маці ў Гайленд Парку. На ўрачыстасці прысутнічалі вернікі беларускіх цэркваў з Нью-Ёрка, Нью-Джэрсі і Канады, прадстаўнікі беларускіх арганізацыяў.

*Паводле belapc.org*

## Юры Малаш (1957-2011)

17 чэрвеня пайшоў з жыцця Юры Малаш, кіраўнік Мінскай абласной арганізацыі "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны", Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі. Юры Малаш быў удзельнікам многіх мастацкіх выставаў і навуковых канферэнцыяў, арганізаваных Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына", часта выступаў на мерапрыемствах у межах грамадскай кампаніі "Будзьма беларусамі!".

Юры Малаш нарадзіўся 16 студзеня 1957 г. у Мінску ў сям'і працоўных. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці "Гісторыя". Працаваў настаўнікам у школах Мінска, у архіве. Апошнім часам — старшым навуковым супрацоўнікам ДУ Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе". Аўтар кніг "Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі" (2007), адзін з аўтараў кнігі "Беларускія маляваныя дываны" (2005).

*Паводле arche.by*

***

**УправаМГА"ЗБС"Бацькаўшчына" выказвае свае шчырыя спачуванні родным і блізкім Юрыя Малаша. Светлая памяць!**

## Васіль Шчэцька (1923-2011)

У Злучаных штатах Амерыкі 27 траўня на 89-м годзе жыцця памёр беларускі патрыёт і грамадскі дзеяч, сябра Рады БНР Васіль Шчэцька.

Нарадзіўся ён у вёсцы Апечкі, што каля Стоўбцаў. Васіль Шчэцька прайшоў праз жыццё складанымі шляхамі і сцежкамі часоў польскай і савецкай акупацыяў, бадзяжнага пражывання ў паваеннай Нямеччыне, працы й навукі ў Вялікабрытаніі, Бельгіі ды Амерыцы.

На працягу даўгіх гадоў жыцця на чужыне Васіль Шчэцька трымаўся свае грамады, дзякуючы чаму здолеў працягваць асвету ў Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы ў Заходняй Нямеччыне, а пасля – у Лювенскім універсітэце ў Бельгіі. Быў актыўным удзельнікам беларускага скаўцкага руху, здабыў сабе ступень скаўтмайстра. Пасля заканчэння гімназіі два з лішнім гады адпрацаваў у ангельскіх вугальных капальнях. У Англіі належаў да так званае Дванаццаткі – групы выпускнікоў Купалаўскай гімназіі, што таксама працавалі ў шахтах. Дванаццаткаўцы за свае зароблены грошы выдавалі месячны часопіс "Наперад!". У 1950 годзе дзевяцём з іх, у тым ліку Васілю Шчэцьку, пашчасціла атрымаць стыпендыі і стацца студэнтамі Лювенскага ўніверсітэта.

З Бельгіі Васіль Шчэцька выехаў у Амерыку. Пасля кароткага часу ўладзіўся на працу ў бібліятэцы Калумбійскага ўніверсітэта ў Нью-Ёрку. Там адпрацаваў дваццаць дзевяць гадоў. Пасля выхаду на пенсію жыў у Нью-Ёрку, займаўся грамадскай працай.

Васіль Шчэцька быў чалавекам лагоднай натуры. Беларус-патрыёт, шчыра адданы сям'і, сябрам, грамадзе, ён заўсёды быў гатовы, пакуль дазваляла здароўе, браць удзел у грамадскіх, рэлігійных ды нацыянальных справах.

*Янка Запруднік, "Радыё Свабода"*

***

**УправаМГА"ЗБС"Бацькаўшчына" выказвае шчырыя спачуванні ўсім, хто ведаў Васіля Шчэцьку, у сувязі з цяжкай стратай. Вечная памяць!**

## Уладзімір Конан (1934-2011)

У ноч з 5 на 6 чэрвеня памёр вядомы беларускі філосаф, літаратуразнаўца Уладзімір Конан. Ён доўгі час быў сябрам Вялікай Рады Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Уладзімір Конан нарадзіўся 23 красавіка 1934 г. у вёсцы Вераскава Навагрудскага раёна Гарадзенскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыў гістарычны факультэт БДУ (1959), з 1962 года працаваў у Інстытуце філасофіі і права АН Беларусі. Доктар філасофскіх навук па спецыяльнасці эстэтыка, з 1991 года загадчык аддзела гісторыі і тэорыі культуры Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Францішка Скарыны. Даследаваў пытанні гісторыі філасофіі, а таксама гісторыі і тэорыі эстэтыкі і літаратуразнаўства Беларусі, з'яўляецца аўтарам шматлікіх кніг і артыкулаў, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР (1984) за цыкл калектыўных даследаванняў па гісторыі філасофіі і грамадскай думкі Беларусі.

***

**УправаМГА"ЗБС"Бацькаўшчына" выказвае шчырыя спачуванні родным і сябрам Уладзіміра Конана ў сувязі з цяжкай стратай. Рай светлы яго душы!**

## ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ (1972-2011)

11 чэрвеня на 39-м годзе жыцця ад цяжкай хваробы памёр палітолаг Віталь Сіліцкі.

Віталь Сіліцкі нарадзіўся 25 снежня 1972 года. Доктар паліталогіі. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці сацыёлаг. Вучыўся ў Цэнтральнаеўрапейскім універсітэце (Будапешт, Вугоршчына), дзе атрымаў ступень магістра паліталогіі, у Ратгерскім універсітэце (Нью-Джэрсі, ЗША), у якім атрымаў ступень доктара паліталогіі. Віталь Сіліцкі быў дырэктарам Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў. Ён даўно супрацоўнічаў са Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына", выступаў на З'ездах беларусаў свету.

Вось што напісаў пасля смерці Віталя Янка Запруднік на сайце газеты "Наша Ніва": "Перадчасная смерць Віталя Сіліцкага нанесла вялізарную страту беларускаму грамадскаму, палітычнаму і навуковаму жыццю.

Выбыў з актыву аналітыкаў сучаснага палітычнага раздарожжа ў Беларусі светлагаловы палітолаг Віталь Сіліцкі. Як каментатар беларускай сучаснасці, Віталь адзначаўся не толькі шырокім кругаглядам — набыткам грунтоўнай

асветы — але і грамадзянскай адвагай. Віталь гаварыў публічна тое, да чаго прыходзіў на аснове аналізу падзеяў і сітуацыі.

Нехта трапна сказаў: трэба быць адважным, каб весці спрэчкі з ворагам, але яшчэ больш адважным, каб спрачацца з сябрамі.

Віталь не баяўся спрачацца з сябрамі, бо навуковая сумленнасць была яму даражэйшай за аднадумства з прыяцелямі".

***

**УправаМГА"ЗБС"Бацькаўшчына" выказвае шчырыя спачуванні родным, сябрам і ўсім, хто ведаў Віталя Сіліцкага, з нагоды цяжкай страты. Вечная памяць!**

## СПАЧУВАЕМ З НАГОДЫ СМЕРЦІ СВЯТЛАНЫ ЯВАР

Пайшла з жыцця паэтэса і літаратуразнаўца Святлана Явар (Святлана Барысаўна Сачанка), дачка вядомага беларускага пісьменніка Б. І. Сачанкі.

Управа МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" шчыра спачувае родным і блізкім Святланы Явар (Сачанка). Вечная памяць!

Святлана Явар нарадзілася ў Мінску 11 ліпеня 1968 года. Скончыла філалагічны факультэт БДУ і аспірантуру Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі. Працавала ў розных беларускіх выдавецтвах, ва Універсітэце культуры, Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтры імя Ф. Скарыны.

Выдала дзве кнігі паэзіі "Белы месяц" і "Раніца ў туманах". Аўтар шматлікіх літаратуразнаўчых і крытычных даследаванняў і артыкулаў у беларускім і замежным друку.

*Управа МГА "ЗБС "Бацькаўшчына"*

## СПАЧУВАННІ ЛЕАНІДУ ЛЫЧУ

Выказваем шчырыя спачуванні сябру Вялікай Рады МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" Леаніду Лычу з нагоды смерці жонкі. Смуткуем разам з Вамі.

*Управа МГА "ЗБС "Бацькаўшчына"*

## АБВЕСТКА

Шаноўныя сябры!

Ліпеньскі нумар бюлетэня "Беларусы ў свеце" будзе спалучаным са жнівеньскім і выйдзе напачатку верасня. Аператыўныя навіны можна прачытаць на сайце zbsb.org, ён паранейшаму будзе аднаўляцца штодзённа.

## БЕЛАРУСКІ КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТ НА ЛІПЕНЬ-ЖНІВЕНЬ 2011 ГОДА

5 ліпеня – 10 год таму, у 2001-м, у Мінску пачаўся Трэці з'езд беларусаў свету (доўжыўся 5–6 ліпеня).

15 ліпеня – 85 год таму, у 1926-м, нарадзіўся Ян Садоўскі (1926-1982), навуковец, скарыназнавец, дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і Канадзе.

16 ліпеня – 110 год таму, у 1901-м, нарадзіўся Аляксандр Крыт (1901-1983), рэлігійны і грамадскі дзеяч, педагог, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Вялікабрытаніі і ЗША.

16 ліпеня – 35 год таму, у 1976-м, у Нью-Ёрку памёр Янка Станкевіч (1891-1976), грамадска-культурны дзеяч, мовазнавец, гісторык, перакладчык, выдавец, публіцыст, педагог, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

21 ліпеня – 120 год таму, у 1891-м, нарадзіўся Сымон Кандыбовіч (1891-1972), грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне.

23 ліпеня – 55 год таму, у 1966-м, у Дэнвіле (Ілінойс) памёр Аляксандр Ружанцоў (1893-1966), грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

24 ліпеня – 115 год таму, у 1896-м, нарадзіўся Аляксандр Орса (1896-1959), педагог, доктар прыродазнаўства, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

25 ліпеня – 95 год таму, у 1916-м, нарадзіўся Мікалай Каранеўскі (1916-1973), інжынер, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

25 ліпеня – 5 год таму, у 2006-м, у Мінску памёр Янка Брыль (1917-2006), народны пісьменнік.

8 жніўня – 35 год таму, у 1976-м, памёр Мікалай Лапіцкі (1907-1976), праваслаўны святар, рэлігійна-грамадскі дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

13 жніўня – 55 год таму, у 1956-м, памёр Якуб Колас (1882-1956), народны паэт Беларусі.

20 жніўня – 20 год таму, у 1991-м, памёр Баляслаў Грабінскі (1899-1991), дзеяч нацыянальнага руху, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**25 жніўня – 20 год таму, у 1991-м, Вярхоўны Савет БССР надаў "Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР" канстытуцыйны статус.**

25 жніўня – 20 год таму, у 1991-м, памёр Вацлаў Пануцэвіч (да эміграцыі Папуцэвіч), грамадскі дзеяч, гісторык, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**Беларусы ў свеце**
№6 (112), чэрвень 2011

Інфармацыйны бюлетэнь МГА "ЗБС "Бацькаўшчына". Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.

Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.
Падрыхтоўка матэрыялаў і вёрстка – Т. Печанко
Адказныя за нумар – Н. Шыдлоўская, А Макоўская
Наклад 250 асобнікаў

Адрас рэдакцыі:
вул. Рэвалюцыйная, 15, г. Мінск 220030, Рэспубліка Беларусь
www.zbsb.org
zbsb@tut.by

тэл./факс (+375 17) 200-70-27